# СІМВАЛ НЕПАРУШНАЙ ДРУЖБЫ

## Ля Кургана Дружбы на мяжы Беларусі, Расіі і Латвіі адбылася 56-я сустрэча ветэранаў Вялікай Айчыннай і партызанскага руху

**Беларускі Верхнядзвінскі і расійскі Себежскі раёны ў мінулую нядзелю сталі месцам, дзе правіў баль дух дружбы. І на латвійскім баку святкавалі. Менавіта там і знаходзіцца курган, ганарова адкрыты ў 1959 годзе як сімвал баявога сяброўства.**

— Традыцыя сустрэч ля Кургана Дружбы закладзена нашымі бацькамі. Гэтая зямля літаральна насычаная крывёй. Мы абавязаны зрабіць усё магчымае, каб пра гэта памяталі нашчадкі пераможцаў, — звярнуўся да прысутных **старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСТНЁЎ**.

Ён пажадаў ветэранам і падпольшчыкам моцнага здароўя і жыць як мага больш.

Да яго далучыўся і **губернатар Пскоўскай вобласці Андрэй ТУРЧАК**. Ён падкрэсліў, што трэба захоўваць памяць аб подзвігу народаў калісьці адзінай краіны. Гістарычная праўда — гарантыя таго, што не будзе перапісана гісторыя.



Мікалай ШАРСТНЁЎ разам з удзельнікамі сустрэчы ветэранаў.

Традыцыйна адбыліся сустрэча прадстаўнікоў афіцыйных дэлегацый трох прыгранічных краін, урачысты мітынг, ускладанне вянкоў і кветак да помнікаў партызанам і падпольшчыкам, святочны канцэрт. Мерапрыемства працягнулі акцыі «Вогнішча Дружбы» і «Агеньчык для ветэранаў».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# Адкрылі дарогу да мікрараёна

**У Гомелі ўчастак дарогі працягласцю 2,5 кіламетра дае магчымасць праезду да 18-га мікрараёна. Новы транспартны калідор павінен разгрузіць буйную магістраль побач і тым самым жыхарам «спальных» 18-га, 19-га, 20-га, 21-га мікрараёнаў будзе куды больш зручна дабірацца ў цэнтр горада над Сожам.**

Гэты аб'ект пачыналі будаваць яшчэ пяць гадоў таму, аднак не хапала грошай для яго завяршэння. Але сёлета, дзякуючы падтрымцы абласных улад, атрымалася адшукаць неабходныя сродкі на працяг будаўніцтва. Па словах старшыні Гомельскага гарвыканкама Пятра Кірычэнкі, у новую дарогу толькі сёлета было ўкладзена Br90 млрд, а гэта практычна 60% ад усяго кошту.

Пад'езд да 18-га мікрараёна — толькі частка праграмы маштабнай рэканструкцыі транспартнай сеткі абласнога цэнтра, якая рэалізуецца на працягу некалькіх гадоў. Летась пасля рэканструкцыі была адкрытая вуліца Барыкіна. Хутка, абяцаюць улады Гомеля, будаўнікі пачнуць рэканструкцыю вуліцы Кірава. Ёсць неабходнасць у пашырэнні вуліц Падгорнай, Валатаўскай, скразных праездаў ад Мазурава на Савецкую. Увасабленне планаў урэшце дазволіць палегчыць транспартную нагрузку і паменшыць заторы на дарогах.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *astashkevich@zviazda.by*

■ Надвор'е

# БАЛТЫКА НАС АСТУДЗІЦЬ

## Аднак яшчэ ў сераду будзе да +36

**Сёння ўдзень надвор'е будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску і чакаецца пераменная воблачнасць. Спецыялісты Белгідрамецэнтра паведамляюць, што анамальная спякота працягне гаспадарыць на тэрыторыі краіны да серады ўключна.**

Удзень у аўторак будзе пераважна без ападкаў, толькі ў паўночных раёнах магчымы невялікі дождж. Вецер паўднёвы з пераходам на заходні ўмераны, пры навальніцах месцамі шквалісты. Максімальная тэмпература паветра будзе складаць ад плюс 22 градусаў па поўначы да 29 цяпла па поўдні краіны. Удзень у сераду да нас завітаюць сур'ёзныя атмасферныя франты з боку Заходняй Еўропы, аднак стане яшчэ цяплей. Таму ўначы на сераду будзе пераважна без ападкаў, а ўдзень у заходніх і цэнтральных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Месцамі чакаюцца навальніцы і магчымы град. Удзень па захадзе краіны пры навальніцах узмацнення моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы на сераду складзе 12-19 цяпла, удзень стане ўжо плюс 28-34 градусы, а па поўдні месцамі прыпячэ да 35-36 цяпла. Аднак у паўночных раёнах у гэты дзень будзе толькі плюс 25-27 градусаў.

Сапраўды кардынальныя змены надвор'я чакаюцца на тэрыторыі Беларусі ўжо ў чацвер. Удзень 9 ліпеня на захад краіны пачне паступаць няўстойлівая і свежая паветраная маса з поўдня Балтыкі. Таму на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, а ўначы і раніцай у паўночна-ўсходніх раёнах месцамі прагназуюцца моцныя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Удзень па захадзе краіны чакаецца моцны парывісты вецер, парывамі да 15-20 м/с. Уначы будзе яшчэ даволі цёпла, калі тэмпература паветра складзе ад 15 да 22 цяпла. Аднак удзень будзе ўжо адчувальнае паслабленне спякоты, калі будзе толькі 20-27 цяпла.

### Тым часам

За мінулыя выхадныя ў Беларусі больш за 130 чалавек звярнуліся па медпамогу з прычыны спякоты, паведаміў начальнік аддзела арганізацыі медыцынскай аховы пры надзвычайных сітуацыях Міністэрства аховы здароўя Алег Панчук.

Спецыяліст паведаміў, што «ў сувязі з гарачым надвор'ем за дні свят звярнуліся па медыцынскую дапамогу 133 чалавекі, з іх 12 грамадзян шпіталізавалі. Найбольшая колькасць пацярпелых з-за спякоты адзначана ў Мінскай вобласці — 90 дарослых (1 чалавек шпіталізаваны) і 22 дзіцяці (адно шпіталізавана)», — удакладніў сітуацыю Алег Панчук.



Фота БЕЛТА.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ЗНОЎ ПЕРШАЯ




**Памятная манета Нацбанка Беларусі «Першая сусветная вайна» стала прызёрам міжнароднага конкурсу**

Гэта спецыяльны прыз аргкамітэта на IX міжнародным конкурсе памятных манет «Манетнае сузор'е-2015», які прайшоў 25-27 чэрвеня ў Маскве. Эксперты ў галіне нумізматыкі з розных краін свету высока ацанілі канцэптуальнасць ідэі манеты «Першая сусветная вайна», а таксама яе тэхнічнае выкананне, адзначылі яе дэкаратыўнасць і якасць чаканкі. На манеце прадстаўлена мастацкая кампазіцыя, якая складаецца з дзвюх частак: справа — фрагмент палітычнай карты Беларусі перыяду заканчэння Першай сусветнай вайны з нанесенай на ёй лініяй падзелу межаў па выніках Рыжскага мірнага дагавора; злева — у тры радкі надпіс «Першая сусветная вайна», яго частка перакрываецца фактурай навальнічных аблокі, якія сімвалізуюць сусветную трагедыю.

У конкурсе ўдзельнічала 240 памятных манет, а таксама 23 манетныя серыі з 29 краін свету. У склад міжнароднага журы ўваходзілі аўтарытэтныя эксперты з музеяў, аўкцыённых дамоў, нумізматычных асацыяцый і спецыялізаваных выданняў аб манетах. За 9-гадовую гісторыю конкурсу памятныя манеты нашага Нацыянальнага банка неаднаразова ўдастойваліся ўзнагарод і станавіліся прызёрамі розных намінацый конкурсу. А ў 2010 годзе ўпершыню ў практыцы конкурсу ўся серыя памятных манет «Знакі задыяка» была адзначана спецыяльным прызам.

«Чарговая перамога беларускай памятнай манеты ў гэтым прэстыжным нумізматычным конкурсе сведчыць аб прызнанні міжнароднай грамадскасцю высокага ўзроўню прафесіяналізму спецыялістаў Нацбанка ў галіне захавання традыцый мастацтва вырабу памятных манет і развіцця нумізматычнага рынку», — лічыць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.** *kuletski@zviazda.by*

■ Нарыхтоўкі

# Чарніцы пайшлі

## Кааператары набываюць гэтыя ягады ў насельніцтва па 15-20 тысяч рублёў за кілаграм

**А ўвогуле Белкаапсаюз сёлета ў першым паўгоддзі закупіў у насельніцтва сельгаспрадукцыі на суму больш як 540 млрд рублёў. І гэта толькі пачатак, лічыць першы намеснік старшыні праўлення Белкаапсаюза Дзмітрый БАРАНАЎ, бо перад саюзам стаіць задача закупляць у насельніцтва ўсе лішкі сельгаспрадукцыі.**

Сёння для зручнасці насельніцтва ў раёны адправіліся мабільныя нарыхтоўшчыкі. Цяпер найбольшая ўвага ўдзяляецца працы ў Лунінецкім, Пінскім і Столінскім раёнах Брэсцкай вобласці, дзе актыўна ідзе закупліванне ў насельніцтва клубніц і агуркоў. Ужо традыцыйна закупачныя цэны тут трапілі ў разрад гнуткага фінансавага інструмента — яны рэгулярна пераглядаюцца ў залежнасці ад сітуацыі на ўнутраным і знешнім рынках. Напрыклад, сёлета непасрэдна ў сезон нарыхтовак былі павышаны закупачныя цэны на клубніцы. Калі таварныя ягады нарыхтоўчыя арганізацыі прымаюць у насельніцтва па 20 тысяч рублёў за кіло, то ягады для кансервацыі — па 5 тысяч, а клубніцы для вінаробства — па 3 тысячы. А вось прыёмныя кошты на дзікарослую прадукцыю (чарніцы, брусніцы і грыбы) ужо не першы год у большай ступені вызначае не ўнутраны рынак, а еўрапейскі і азіяцкі. Сёння спажыўкааперацыя закупляе ў насельніцтва чарніцы па 15-20 тысяч рублёў за кілаграм, аднак і гэтая цана штодня карэктуецца.

А яшчэ Дзмітрый Баранаў удакладніў, што сёлета ў структуры закупак сельгаспрадукцыі ад насельніцтва Белкаапсаюз зрабіў галоўную стаўку на супрацоўніцтва з сялянскімі і фермерскімі гаспадаркамі. Сёлета з імі заключаны 603 дагаворы на вырошчванне пад заказ 21 тысячы тон.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю былога намесніка міністра інфармацыі КЕДЗІЧА Юрыя Канстанцінавіча і выказвае глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» смуткуе ў сувязі са смерцю былога намесніка міністра інфармацыі Юрыя Канстанцінавіча КЕДЗІЧА і выказвае глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский пищеторг» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

- **продовольственный склад с конторой (одноэтажное кирпичное здание с конторой)** (инв. № 610/С-27247) общ. пл. **626** кв.м;
- **ящик электрический (трансформатор тока)** (инв. № по бух. учету 1002240);
- **узел учета и регулирования тепла** (инв. № по бух. учету 1002249).

Указанное имущество расположено на земельном участке площадью **0,2207 га** с кадастровым номером 320850100008000943 по адресу: Минская обл., г. Борисов, ул. Герцена, 15 (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

**Начальная цена с НДС – 3 558 145 800 бел. руб.**

**Задаток 10% от начальной цены (355 814 000 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **06.08.2015** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.08.2015** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**